Отдел образования Калинковичского
районного исполнительного комитета

Районный фестиваль педагогического мастерства
«Методическая весна – 2021»
Номинация «Мой лучший урок»

# Падваенне зычных на стыку кораня і суфікса

Урок белорусского языка в 3 классе

Из опыта работы
Колесниковой Татьяны Геннадиевны,
учителя начальных классов
высшей квалификационной категории
государственного учреждения
образования «Средняя школа №6
г.Калинковичи»

2021

**Урок 50. Падваенне зычных на стыку кораня і суфікса.**
**Мэта:**сістэматызацыя звестак пра часткі слова
**Задачы:** развіваць уменне вызначаць корань і суфікс у словах, пазнаёміць з умовамі падваення зычных на стыку кораня і суфікса, фарміраваць навык правапісу слоў з падвоенымі зычнымі, практыкаваць у разборы слова па саставе,
развіваць арфаграфічную пільнасць, узбагачаць слоўнікавы запас;
выхоўваць уважлівае стаўленне да слова.
Абсталяванне: карткі для індывідуальнай работы, гексы, прэзентацыя, аўдыёзапіс фізкультхвілінкі.

**Ход урока**

**I Арганізацыйны момант.**

Добры дзень, паважаныя вучні.
Сёння на ўроку мы будзем добра працаваць. Вы ведаеце, што такое скарб? (грошы, каштоўнасці)
Якія ж каштоўнасці мы знойдзем на ўроку? Веды.
Скарбам могуць быць не толькі грошы, але і веды. Чаму? Што даюць нам веды? (Упэўненасць, веру ў свае сілы, незалежнасць ад меркавання другіх)
Пачнем урок, будзем пашыраць свае веды.

**II Этап праверкі дамашняга задання.**

Праверым дамашнее заданне.
***Для індывідуальнай работы***
Разабраць словы па саставе. Работа па картках.

| 1 | 2 |
|---|---|
| смелы | вясёлы |
| падказка | узлесак |
| пералётныя | прабежка |
| бязмежны | бязмерны |
| падлесак | прыбрэжны |

**III Падрыхтоўка вучняў да засваення новага матэрыялу**

Якія часткі слова вы ведаеце? (работа з гексамі) Паглядзіце на свае карткі, размясціце патрэбныя карткі на нашу схему.
Якая частка слова служыць для сувязі слоў у сказе? Што абразуе канчатак?




Што можа аб’ядноўваць прыстаўкі і суфіксы? (Яны ўтвараюць новыя словы).
Знайдзіце на сваіх картках суфіксы. Дабаўце іх у схему.
Якое адценне надаюць словам суфіксы –аньк-, -еньк-, эньк-,-ок-, ік-, -к-. (памяншальна-ласкальнае)
З дапамогай якіх суфіксаў утвараюцца словы-назвы дзіцянят жывёл? (-ан-, -ян-)
Ці ёсць у вас лішнія карткі? Што змешчана на іх? (прыстаўкі) Назавіце іх.

Паглядзіце на экран. Прачытайце словы. (слайд 1)
Рассыпаць, аддаць, каменны, рассмяяліся, асенні, бяздонны.

Што аб’ядноўвае ўсе гэтыя словы? (падваенне зычных) (слайд 2)
Дзе адбываецца падваенне? (на стыку частак слова)

**Чыстапісанне**

Якія зычня падвоіліся?
сс дд нн
Назавіце словы, у якіх падваенне адбылося на стыку кораня і суфікса.
Каменны, асенні, бяздонны. (слайд 3)
Адкрыйце сшыткі. Прапішыце спалучэнні літар да канца радка.
Прапішыце словы з падвоеннымі зычнымі.
Вызначце корань і суфікс.
Якая тэма нашага ўрока?
Падваенне зычных на стыку кораня і суфікса. (слайд 4)
Якую задачу ставім на ўроку?
Навучыцца знаходзіць словы, у якіх ёсць падваенне зычных і правільна іх пісаць. Адказаць на пытанне: “У якіх выпадках пішуцца дзве літары на стыку кораня і суфікса?” (слайд 5)

**IV Этап засваення новага матэрыялу**

Адкрыйце кнігі на с.37,пр 62.
Утварыце словы па ўзору. (вучань ля дошкі)
У якіх словах адбываецце падваенне зычных?
Толькі ў тых, у якіх корань заканчваецца на такія ж зычныя.
Пр.63 – выпісаць ланцужок з слоўнікавым словам.
Прачытаем правіла.
Фізкультхвілінка

**V Этап замацавання**

Пр 65 – выбарачнае спісванне (2 вучні ля дошкі)
Пр 64 – самастойна.
Мы заканчваем вывучэнне тэмы “Склад слова”. Праверым, ці добра мы ведаем.
Выкананне тэста.
https://eior.unibel.by/catalog_lecture/3-klass/belmova/18.php
(калі ссылка не спрацуе слайд 6-11)

**1.Суфікс – гэта частка слова, якая**

- ○ **стаіць перад коранем і служыць для ўтварэння слоў**
- ○ **стаіць пасля кораня і служыць для ўтварэння слоў**

**2.Адзначце слова, у якім ёсць суфікс -к-**

- ○ **грыбок**
- ○ **загадка**
- ○ **ключык**

**3.Суфіксы -еньк-, -аньк-, -эньк-, -к-, -ік-, -ык-, -ок-**

- ○ **дапамагаюць утвараць словы – назвы дзіцянят жывёл**

- надаюць значэнню слова памяншальна-ласкальнае адценне
- дапамагаюць утварыць словы – назвы людзей паводле іх заняткаў, прафесій

**4.Адзначце суфіксы, якія выкарысталі для ўтварэння слоў ваўчаня, лісяня**

- -еньк-, -аньк-, -эньк-, -к-, -ік-, -ык-, -ок-
- -іст-, -ыст-, -ар-, -ор-, -чык-, -шчык-
- -ан-, -ян-

**5.Адзначце рад, дзе ва ўсіх словах пішацца -нн-**

- тума..ы, мод..ы, ра..і
- со..ы, сасо..ік, карэ..ы
- галод..ы, хат..і, зор..ы

Абмяняйцеся сшыткамі. Праверце. (слайд 12)
1б, 2б, 3б, 4в, 5б.

Дадатковы матэрыял. (слайд 13,14,15)
Складзі словы. Для гэтага неабходна ўзяць патрэбныя часткі са слоў, змешчаных у табліцы.
Праца па варыянтах.

| **Прыстаўка** | **Корань** | **Суфікс** | **Канчатак** | **Слова** |
|---|---|---|---|---|
| 1. падкінуць | накорміць | дзянькі | бяроза | падкормка |
| 2 бяскрыўдны | край | вобразны | людзі | |
| 1 прачытаў | лесавік | горка | вучоба | |
| 2 зямля | лета | стальны | ціхія | |
| 1 пайшоў | садоўнік | вушка | сіні | |
| 2 прагулка | вада | будаўнік | коцік | |

**VI Кантроль і самакантроль ведаў. Падвядзенне вынікаў работы. Рэфлексія**

Ці знайшлі мы адказ на пытанне? У якіх выпадках пішуцца дзве літары?
Ці ўдалося нам дасягнуць мэты ўрока? Думаючы пра свае дасягненні на ўроку, працягніце фразу (слайд 16):
Я даведаўся, што ….
Я зразумеў…
Я ведаю…

Приложение 1













